# Мая прыгожая краіна

**Напрыканцы мінулага года ў новым Мінскім міжнародным выставачным цэнтры начала працу ўнікальная выстаўка «Мая Беларусь». Маштабны праект дазваляе ўбачыць будучыню краіны праз сучаснасць, пазнаёміцца з дасягненнямі за гады незалежнасці ў касмічнай, навуковай, спартыўнай, культурнай і іншых сферах дзейнасці. Значнае месца адведзена і пляцоўкам прыродаахоўнай галіны.**

Выстаўка «Мая Беларусь» займае больш за 30 тыс. м$^2$. На вялізнай тэрыторыі знаходзяцца экпазіцыя, зона культурных мерапрыемстваў, шматлікія фотазоны і лакацыі «Мая Беларусь - месца сілы», дзе прадстаўлены дасягненні за 30 год: «Прыгожая краіна», «Разумны горад», «Навука і інтэлект», «Клопат і здароўе», «Мы - будучыня», «Атамная энергія» і інш.

- Усё, што зроблена ў Беларусі, - зроблена дзякуючы інтэлекту і працы нашых людзей. У рамках выстаўкі мы бачым розныя тэматычныя блокі, якія падкрэсліваюць не толькі гісторыю станаўлення краіны, але і паказваюць перспектыву будучыні, - адзначыў міністр адукацыі **Андрэй ІВАНЕЦ.** Паводле яго слоў, у рэспубліцы пачалі рыхтаваць новых спецыялістаў у галіне хімічных, ядзерных і інфармацыйных тэхналогій, матэрыялазнаўства. Актыўна развіваюцца атамная энергетыка, біятэхналогіі, іншыя інавацыйныя напрамкі навукі.

На новы ўзровень выйшла і такая традыцыйная галіна, як машынабудаванне. Андрэй Іванавіч падкрэсліў, што стварэнне экалагічна чыстых транспартных сродкаў (электробусаў, гібрыдаў, электрасамазвалаў і інш.) - ужо старонка гісторыі суверэннай Беларусі, якая непарыўна звязана з сучаснымі распрацоўкамі і інтэлектам. Паглядзець на дзівосы электранспарта і інвацыйныя тэхналогіі экалагічна чыстай будучыні можна ў тэматычным кластары «Разумны горад». Практычна кожнае з лічбавых рашэнняў інтэрактыўнае.

**Прыгожая краіна**

Найбольш перспектыўныя вектары развіцця і сучасныя дасягненні краіны ў сферы экалогіі і ўстойлівым прыродакарыстанні, інавацыйныя тэхналогіі і распрацоўкі прадстаўлены ў экспазіцыі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Дарэчы, пляцоўка «Прыгожая краіна» падрыхтавана адразу трыма арганізацыямі: Мінпрыроды, Міністэрствам лясной гаспадаркі і канцэрнам «Белляспаперпрам».

– Тэма, якая аб’ядноўвае нас, - лес і экалогія. У Беларусі сёння налічваецца больш за 1355 асабліва ахоўных прыродных тэрыторый (ААПТ). Гэта 9,2 % ад тэрыторыі ўсёй краіны - дастаткова высокі паказчык. Найболып іх у Віцебскай, Брэсцкай і Гродзенскай абласцях, - адзначыў міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя **Сяргей МАСЛЯК**.

Дарэчы, у рамках выстаўкі «Мая Беларусь» адбываюцца мерапрыемствы, накіраваныя на абмеркаванне развіцця турыстычнага патэнцыялу розных абласцей і ААПТ.

- Пытанні стварэння ўмоў для развіцця эка- лагічнага турызму заслугоўваюць асаблівай увагі. Экалагічны турызм - дзейнасць, якая не толькі прыносіць даходы. Ён адыгрывае важную ролю ў павышэнні дасведчанасці грамадзян аб унікальных прыродных тэрыторыях Беларусі, з’яўляецца неад’емным элементам дзейнасці па ахове навакольнага асяроддзя, - падкрэсліў падчас круглага стала, прысвечанага экатурыстычным магчымасцям Віцебшчыны, Сяргей Міхайлавіч.

Па стэндзе Мінпрыроды можна азнаёміцца з відэа практычна ўсіх нацыянальных паркаў, заказнікаў, запаведнікаў, помнікаў прыроды рэспубліканскага і мясцовага значэння. Экспануюцца і цікавыя прыклады нестандартнага падыходу да арганізацыі экатурызму. Напрыклад, спецыяльная дрызіна, якая возіць турыстаў па адзіным у

Беларусі і Еўропе маршруце «Занаведны шлях». Такое крэатыўнае рашэнне прадставілі супрацоўнікі Рэспубліканскага ландшафтнага заказніка «Азёры». Паводле слоў дырэктара ўстановы Дзмітрыя МАРОЗІКА, працягласць руху па вузкакалейцы складае 10 км пры хуткасці каля 10км/г, а максімальная колькасць групы - 20 чалавек. Дзякуючы спецыяльным акулярам віртуальнай рэальнасці, можна завочна ажыццявіць тур на дрызіне і атрымаць асалоду ад краявідаў ААПТ.

Шырока прадстаўлены ў экалагічным кластары і дасягненні розных ведамстваў сістэмы Мінпрыроды ў сферы аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнага карыстання прыроднымі рэсурсамі. Так, на стэндзе Белгеацэнтра можна даведацца аб багацці беларускіх нетраў: відах карысных выкапняў (калійнай і каменнай солях, торфу, пяску, сапрапелю і інш.), іх значэнні ў будаўніцтве, лёгкай і цяжкай прамысловасці і іншых галінах народнай гаспадаркі, дэталёва разгледзець макет свідравой устаноўкі для здабычы нафты. Не абышлі і тэму добраўпарадкавання гарадоў.

- Зараз асаблівая ўвага надаецца азеля- ненню населеных пунктаў. Многія выязджаюць адпачываць на прыроду, аднак болып часу людзі праводзяць усё роўна ў спальных раёнах. Мы імкнёмся павялічыць колькасць зялёных насаджэнняў, пачынаючы ад сквераў і заканчваючы пасадкай дрэў уздоўж дарог. Гэта павышае не толькі якасць атмасфернага паветра, але і ўзровень жыцця ў цэлым, - расказала намеснік начальніка Белгідрамета Святлана КУЗЬМІЧ.

## Зялёныя тэхналогіі

Акрамя экспазіцыі Мінпрыроды, на выстаўцы ёсць і іншыя пляцоўкі, прысвечаныя зялёным тэхналогіям. Напрыклад, на стэндзе Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В. Ф. Купрэвіча Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі сярод іншага раскажуць аб вырабе прадукцыі ў сферы малатанажнай хіміі і правядуць прэзентацыю дробнафасаванага торфу.

- Зараз вялікім попытам карыстаюцца тавары ўнутранага рынку. Для яго найбольш актуальныя не вялікія брыкеты, а менавіта дробная фасоўка, - адзначыў дырэктар інстытута **Дзмітрый ГРУМО.** - Другая частка нашай экспазіцыі прадстаўлена рознымі выданнямі аб жывёльным і раслінным свеце нашай краіны: нядаўна надрукаваным чацвёртым томам фундаментальнай працы «Флора Беларусі», Чырвонай і Чорнай кнігамі і інш.

Выстаўка «Мая Беларусь» з’яўляецца цэнтрам прыцягнення для ўсіх, хто хоча болын даведацца аб магчымасцях, традыцыях, інавацыях і галоўных перамогах нашай краіны. Мноства інтэрактыўных элементаў, спецыяльныя гульнявыя пляцоўкі, незвычайныя фотазоны, шматлікія прэзентацыі і канцэрты не пакінуць абыякавымі ні дарослых, ні дзяцей.

**Марыя САМАЛЬ**